







# Машына часу з Муравы

Машына часу існуе. У гэтым вы пераканаецеся ў Мураве, невялікім аграгарадку Пружанскага раёна. Касмічны апарат тут не пакажуць, але краявіды космасу ўбачыце абавязкова.

Далёкія сусветы намаляваны мастаком у адным з пакояў механічных майстэрняў. Там жа (варта азірнуцца) вы пераляціце з будучыні ў мінулае. На вялікім маляўнічым пейзажы бачны селянін, які ідзе па полі за драўлянай сахой. Вам растлумачаць: за спіною мясцовага аратага высіцца старажытная царква, дзе больш за паўтара стагоддзя таму была першая ў гэтай мясцовасці школа.

Падарожжа ў часе мае адбыцца не толькі з дапамогай мастака, але і дзякуючы ўмелым рукам мясцовых майстроў. Гэта яны зрабілі макет аднаго з першых трактароў — далёкага продка сённяшніх энерганасычаных волатаў. Паставілі ўмельцы такі макет на п'едэстал і прымацавалі шыльдачку з тлумачэннем: у красавіку 1941 года на гэтай зямлі быў створаны першы калгас «Чырвоная Мурава». Прыходзьце калі ласка, аглядайце ўнікальны трактар, уяўляйце сябе першым мураўскім механізатарам!

Машына часу з Муравы працуе на невычарпальным паліве — энергіі творчасці вясковых майстроў. Слесары, зваршчыкі — упрыгожваюць вёску па правілах, здаўна сфарміраваных тутэйшым дызайнам. Паглядзіце на фотаздымкі: як вытанчана выглядаюць зробленыя ў кузні завесы для дзвярэй у пакоях рамонтных майстэрняў! Колькі прыгажосці ў празрыстых абрысах дэкаратыўнага металічнага крэсла на вулічным газоне! Як грацыёзна плывуць па двары фермы белыя казачныя птушкі! Зрабілі ў Мураве нават «старажытную гармату» — відаць, такой зброяй абаранялі продкі нашу зямлю ад захопнікаў.

Фантазія і майстэрства — гэта і ёсць машына часу.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**





